## Інфінітывы ўсіх часоў і станаў

1. **Infinitīvus praesentis actīvi** утвараецца ад асновы infectum з дапамогай суфіксаў -**re** (I, II, IV спр.), -**ĕre** (III спр.; у IIIб спр. канцавы галосны асновы **ĭ** выпадае):

| I спр. | II спр. | IIIа спр. | IIIб спр. | IV спр. |
|---|---|---|---|---|
| laudā-**re** | docē-**re** | scrib-**ĕre** | cap-**ĕre** | audī-**re** |

2. **Infinitīvus praesentis passīvi** утвараецца ад асновы infectum з дапамогай суфіксаў -**ri** (I, II, IV спр.), -**i** (III спр.; у IIIб спр. канцавы галосны асновы **ĭ** выпадае):

| I спр. | II спр. | IIIа спр. | IIIб спр. | IV спр. |
|---|---|---|---|---|
| laudā-**ri** | docē-**ri** | scrib-**i** | cap-**i** | audī-**ri** |

3. **Infinitīvus perfecti actīvi** утвараецца ад асновы perfectum з дапамогай суфікса -**isse**:

| I спр. | II спр. | III спр. | IV спр. |
|---|---|---|---|
| laudav-**isse** | docu-**isse** | scrips-**isse** | audiv-**isse** |

4. **Infinitīvus perfecti passīvi** утвараецца спалучэннем participium perfecti passīvi з формай **esse**:

| I спр. | II спр. | III спр. | IV спр. |
|---|---|---|---|
| laudātus, a, um<br>esse | doctus, a, um<br>esse | scriptus, a, um<br>esse | audītus, a, um<br>esse |

5. **Infinitīvus futūri actīvi** утвараецца спалучэннем participium futūri actīvi з формай **esse**:

| I спр. | II спр. | III спр. | IV спр. |
|---|---|---|---|
| laudatūrus, a, um<br>esse | doctūrus, a, um<br>esse | scriptūrus, a, um<br>esse | auditūrus, a, um<br>esse |

6. **Infinitīvus futūri passīvi** утвараецца спалучэннем формы supīnum з формай **iri**:

| I спр. | II спр. | III спр. | IV спр. |
|---|---|---|---|
| laudātum iri | doctum iri | scriptum iri | audītum iri |

**Формы інфінітыва**
**дзеяслова sum, fui, —, esse — *быць***

| Infinitīvus praesentis | Infinitīvus perfecti | Infinitīvus futūri |
|---|---|---|
| esse | fuisse | futūrus, a, um esse;<br>fore |

## Зварот accusativus cum infinitivo (вінавальны склон з інфінітывам)

Складаецца з лагічнага дзейніка (назоўнік, прыметнік, займеннік у accusatīvus) і лагічнага выказніка (infinitīvus).

Зваротам кіруюць:

а) дзеясловы ў незалежным стане са значэннямі: *гаварыць*, *паведамляць*, *адказваць*, *расказваць*, *вучыць*, *сцвярджаць*, *адмаўляць*, *пісаць*; *думаць*, *лічыць*, *меркаваць*, *ведаць*, *адчуваць*, *верыць*, *спадзявацца*, *бачыць*, *чуць*; *загадваць*, *забараняць*, *дазваляць*, *жадаць*, *не жадаць*, *аддаваць перавагу*; *радавацца*, *смуткаваць* і г. д.;

б) безасабовыя дзеясловы і выразы з аналагічнымі значэннямі: fama est — *ёсць погалас*; notum est — *вядома*; constat — *вядома*; mos est — *ёсць звычай*; oportet — *варта*; decet — *варта*; intĕrest — *важна*; necesse est — *неабходна*; fas est — *дазволена*, *можна*; nefas est — *недазволена*, *нельга* і г. д.).

Зварот перакладаецца даданым дапаўняльным сказам са злучнікамі *што*, *каб*; лагічны дзейнік перакладаецца назоўным склонам, лагічны выказнік — асабовай формай: Pater videt [filium librum legĕre]. — *Бацька бачыць*, *што сын чытае кнігу*.

З а ў в а г а. Пры аналізе сказа кіруючы дзеяслоў падкрэсліваецца хвалістай лініяй, лагічны дзейнік — адной лініяй, лагічны выказнік — дзьвума лініямі; зварот змяшчаецца ў квадратныя дужкі.

Infinitīvus praesentis указвае на аднaчасовае дзеянне, infinitīvus perfecti — на папярэдняе, infinitīvus futūri — на будучае: Pater videt [filium librum legisse]. — *Бацька бачыць*, *што сын прачытаў кнігу*. Pater sperat [filium librum lectūrum esse]. — *Бацька спадзяецца*, *што сын прачытае кнігу*.

Іменная частка лагічнага выказніка дапасуецца да лагічнага дзейніка ў ліку і склоне: Pater sperat [filios librum lectūros esse]. — *Бацька спадзяецца*, *что сыны прачытаюць кнігу*. Pater sperat [filiam librum lectūram esse]. — *Бацька спадзяецца*, *што дачка прачытае кнігу*.

Калі лагічны дзейнік адсутнічае, г. зн. калі лагічны выказнік ужыты безасабова, ужываецца інфінітыў залежнага стану: Pater jubet [legi]. — *Бацька загадвае чытаць* (літ.: *каб чыталася*).